№ 5 (42) Вільня, сакавік 1925 г. Цана асобнага нумару 10 грошау.

Рабочыя і сяляне усіх краёў, злучайцеся!

ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

ОРГАН КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

Няхай жыве злучаная Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка!

НА СУД КАМУНІСТЫЧНАЕ АПІНІІ.

ДА ЎСІХ СЯБРОЎ КАМУН. ПАРТЫІ ЗАХ. БЕЛАРУСІ. —— ДА КАМПАРТЫІ ЗАХ. УКРАІНЫ. —— ДА СЯБРОЎ КАМПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ. —— ДА ЎСІХ КАМПАРТЫЯЎ, ПРАЦУЮЧЫХ У ПАДПОЛЬЛІ. —— ДА СЯБРОЎ КАМІНТЭРНУ.

Таварышы!

Паміж цантральнымі партыйнымі арганамі Заходнейй Беларусі і Польшчы ўзьняўся нядаўна востры канфлікт на грунце расходжаньня па палітычных і тактычных пытаньнях. Сутнасьць гэтага расходжаньня апублікована у камунікаце ЦК нашай партыі ў № 2 „Бальшавік". Уступаючы ў ідэйную спрэчку з афіцыяльнай лініяй цяперашняга Ц.К. кампартыі Польшчы, Ц.К. кампартыі Зах. Беларусі думаў, што абедзьве стораны праявяць найбольш рэвалюцыйнай вытрымкі і добрай волі, каб супольна высьніць усе набалеўшыя пытаньні ўзрастаючага рэвалюцыйнага руху ў Зах. Беларусі, волей буржуазіі папаўшай у становішча акупованай краіны. Аднак сталася ўсё горшае і не пажаданае, што можна было чакаць і спадзявацца.

Вам ведама, якое аграмаднае значэньне мае ў падпольнай працы добра абстаўленая падпольная друкарня. Ня гледзючы на канфлікт паміж намі і цяперашнім польскім ЦК — мы ўсё-ткі пастанавілі не пераносіць партыйнай друкарні ў другое месца, бо мяркавалі, што гэты канфлікт зьяўляецца спрэчкай у партыйнай сямье і не дае ніякога права ні нам ні супраціўнай старане разрушаць найдаражэйшую партыйную маемасьць, дабытую з вялікімі труднасьцямі.

Аднак 18 студзеня 1925 г. у вечары ў падпольную друкарню кампартыі Зах. Беларусі, друкаваўшую газэты „Чырвоны сьцяг" і „Бальшавік", урвалася чатырох малайцоў, разабралі станкі, усыпалі шрыфты ў мяшкі і з нескрываемай злосьцяй і зьдзічэньнем зглумілі і спалілі рэшту друкарскіх прыладаў і вывезьлі з сабой галаўнейшыя яе часткі. У друкарні былі тады толькі гаспадары кватэры, якім малайцы загадалі маўчаць, пагражаючы зьвязаць іх і заткнуць ім рты. На пярэдадні была забрана апошняя партыя № 4 газэты „Чырвоны Сьцяг" і работнікі пашлі на супачынак, дзякуючы чаму „адважныя малайцы" маглі зрабіць сваю ганебную справу бяскарна.

Хто-ж такія гэтыя малайцы? Гэта паслугачы ЦК кампартыі Польшчы, што было відаць з астаўленай праз іх запіскі, а так-жа і з таго, што ў Варшаве ўжо 10 студзеня уверялі, што друкарня наша будзе забрана і „Бальшавік" і „Чырвоны Сьцяг" болей выхадзіць ня будуць.

Наш „Бальшавік" крытыкаваў тактыку і палітыку цяперашняга ЦК Польшчы, асабліва яго работу на грунце Зах. Беларусі. Скрыўджаны, як відаць, гэтай крытыкай Цэка Польшчы неадкладна пасьля паяўленьня № 2 „Б." праз сваіх неразборчывых агентаў пачаў пашыраць самыя гідкія кляузы, паклёп на падпісаўшых камунікат сяброў ЦК кампартыі З. Беларусі, пачаў расканспірываць партыйныя тайны і дашоў да нячуваннага ў гісторыі рэвалюцыйнага руху праступленьня: зруйнаваў з аграмаднымі стараньнямі ня ім зладжаную нялегальную камуністычную друкарню.

Так як мы ўжо чераз дзьве нядзелі пасьля разгрому выпусцілі чарговы нумар „Бальшавіка" з нанава абстаўленнай партыйнай друкарні, а ЦК Польшчы ў асобе аднаго з сваіх сяброў заявіў, што будзе вясьці барацьбу з намі „аж до упадлэго", каб „аканчальна" „ліквідаваць" „авантуру", — дык трэба спадзявацца, што ён будзе ўжываць спосабаў ня меньш „гэраічных" і ў далейшай барацьбе...

Якім спосабам агенцікі Варшавы маглі дабрацца да нашай падпольнай друкарні?

Зусім проста! Яны сачылі яе ў працягу дзесяці дзён... Так як некаторыя ніткі сувязі з друкарняй былі ў руках ЦК Варшавы, дык шляхам сыска ім ня трудна было дабрацца да мэты. Чэсьць ім і слава за сышчніцкія здатнасьці! Ім можа пазайздрараваць польская ахранка, якая ня гледзючы на скавытаньне панскіх газэт у Зах. Беларусі, на сьлед друкарні не напала. Але ахранка можа супакоіцца—яе работу зрабілі стаўленьнікі ЦК Польшчы.

ЦК „Вшэхпольшчы", грабючы і руйнуючы нашу друкарню, разлічаў пасваему правідлова. Без друкарні ЦК кампартыі Зах. Беларусі ня мог бы так шырока рeзьвярнуць сваю агітацыйную і арганізацыйную працу сярод масаў. На будову-ж новай друкарні патрэбны найперш вялікія затраты ў грашах і часе.

Але балюча ашукаўся ў сваіх намерах вшэхпольскі камуністычны імпэрыялізм. Рэвалюцыйны рух Зах. Беларусі жывучы і ў сваіх сяброх маець нявычэрпныя крыніцы энэргіі і нішто гэты рух ня зломіць.

Зазначаем, што нам лёгка было дабрацца да месца, дзе знаходзіліся часткі аграбленай нашай друкарні. Але мы іх не чапалі, каб памінуць скандал і расканспіраваньне.

Таварышы!

Італьянскія фашысты нападаюць на камуністычныя рэдакцыі, друкарні, памешкані прафсаюзаў, руйнуюць іх і паляць.

Цяперашні ЦК „Вшэхпольшчы" ідзе па іх сьлядох і ў барацьбе з камуністамі паднявoленых праз Польшчу народаў перайшоў італьянскіх фашыстаў.

Прапануем усім арганізацыям кампартыі Зах. Беларусі, кампартыі Зах. Украіны, камуністычным ячэйкам этнаграфічнай Польшчы, такжа ўсім кампартыям усіх краін і Камінтэрну абсудзіць нячуваный, ахраніцкі, фашыцка-грабежны, кантрэвалюцыйны паступак „ЦК Кам Раб. Партыі Польшчы" і вынясьці свае рэзалюцыі.

Цантральны Камітэт Кам. Партыі Зах. Беларусі.

Выражаем сваё глыбокае абурэньне і спагарду да варшаўскіх імпэрыялістаў-„цэкістаў" за іх дзікі паступак — разрушеньне нашай камуністычнай друкарні, на будову і наладжаньне якой мы патрацілі столькі нэрваў і сіл. Моцна шкадуем, што ня былі прысутнымі у часе іхняга хуліганскага наскоку—жывымі варшаўскія бандыты на вышлі-бы. Трэбуем ад польскага пралетарыята, каб ён выкінуў вон з сваіх радоў ініцыятараў разгрома друкарні і выбраў сабе праваДыроў, якія-б змаглі кіраваць слаўным польскім рабочым рухам.

Рабочыя зруйнованай друкарні К. П. З. Б.

ШЫРЭЙ І ГЛЫБЕЙ РАЗМАХ БАРАЦЬБЫ.

Польска-панская крутуха ў палітыцы асабліва адчуваецца тут у Зах. Беларусі. То-ж нядаўна польская буржуазія, ляскаючы зубамі з Варшавы манілася рэвалюцыйны рух, а значыць і усё сялянства Зах. Беларусі задушыць, скрышыць, зьмясьці. Аднак што мы бачым. Самыя грозныя і надзейныя ген.-ваеводы і тыя паламалі сабе зубы на крэсавых гарэхах, здагадаліся відаць, што ім горш можа быць сухой лазьні ваеводы Даўнаровіча, ды бардзей задалі лататых. Далей паны маняцца ўстрымацца ад рэквізыцыяў сельска-гаспадарчых рэчаў за неаплачаныя падаткі, думаюць урэгуляваць беларускае школьнае пытаньне, абяцаюць падзяліць маёнткі сярод месцовага жыхарства.

Ня трэба забывацца, што гэта толькі пакуль яшчэ панскія абецанкі. Але хаця-бы і пачалі яны так ці іначэй праводзіцца ў жыцьцё, дык з нашага боку будзе вялікай праступнасьцяй перад рэвалюцыйнай будучыняй, калі мы хоць часткова ўздумаем задаволіцца гэтымі падачкамі, калі мы хоць на момант спынім свой рэвалюцыйны імпэт. Памножанай энэргіяй, большай палкасьцяй павінны ўзьвялічыць барацьбу ў шырыну і глыбіну—арганізацыйна і ідэолёгічна. Нашы клічы: непахістны байкот падаткаў, улады, польскай школы. Гусьцей сетку партыйных ячэяк і тайных беларускіх школ.

Кожны селянін павінен лічыць жыцьёвай патрэбай і рэвалюцыйным абавязкам ні граша не даваць у польскую казну. За акуратнай і агульнай нявыплатай падаткаў павінен сьлядзіць тайны вясковы камітет, які выбіраецца з бяднейшых сялян.

Што да падзелу панскіх маёнткаў на пограніччы, дык зямлю гэтую бяром толькі праз нашыя зямельныя камітэты, ў склад якіх уваходзяць бяднейшыя сяляне. Зямлю бяром няінакшай як бяз выкупа і требуем падзелу ня толькі ўсей абшарніцкай, але скарбовай і манастырскай зямлі, а також выдаленьне ўсіх асаднікаў, якія ў часе жэліговшчыны грабілі сялянскую маемасьць, а цяпер за самаволю атрымліваюць зямлю, належную да тых жа сялян. Адняўшы ў паноў маёнткі, ўрад абложыць сялян вялікім выкупам і на доўгія часы, так што хопіць выплачываць і ўнукам і праўнукам. На гэтай справе добра хочуць нагрэцца і паны і іхні ўрад. Дык у ніякім выпадку не плаціць выкупаў за тую зямлю, якая у хуткім часе будзе нямінуча належыць да сялян.

Сяляне павінны уясьніць сабе, што гэтыя ўступкі ёсьць адступленьне польскага ўраду, яго страх перад рэвалюцыйнай будучынай, перад дыктатурай пралетарыяту. Гэтыя палёгкі даюцца не дзеля таго, каб палепшыць быт сялян, а каб іх на час успакоіць, ашукаць, а сабе зрабіць перадышку, у часе якой паны ўзмацуюцца, каб нанясьці ўдар працоўным яшчэ з большым размахам.

Адступаючы і адзываючы генералаў з Зах. Беларусі, польскі ўрад перадае аружжа ў рукі польскае шляхты і асаднікаў. Ўрад хаваецца за плечы адвечных тутэйшых жывадзёраў-шляхту і сваіх паслугачоў-асаднікаў, якія сумесна з паліцыяй і корпусам прыграніцных войск будуць ў імя „ойчызны і самообраны" рабіць карацельныя набегі на безбаронных сялян, на вёскі.

Наша задача быць гатовымі адбіць гэты новы удар. Хай за ахвяры даразных судоў, за фашыстоўскае выступленьне ўзброеннай шляхты адказвае галава акупанта, сядзіба пана і асадніка ды паліцэйскі пастарунак. Трэба быць гатовымі да рашучага мамэнту. Мабілізаваць працоўную масу, арганізаваць баевую сьвядомасьць, трымаць аружжа на гатове. Бо можа недалекі той час, калі прыйдзецца папярэдзіць іхні ўдар сваім ударам і гнаць, і біць ня толькі генерал-ваяводаў, але ўсіх паноў,—да апошняга акупанта.

Дык шырэй размах барацьбы!

Цьвярдзей рэвалюцыйны шаг!

ШТО НАМ РАБІЦЬ.

Хто з нас будзе ад бяды
Клікаць бога і стагнаць,
Той не беларус тады,
З ганьбай трэба гэткіх гнаць.

Маем што рабіць цяпер,
Маем моц працоўных рук,—
Распладзіўся вораг-звер,
На аблаву-ж бяз прынук!

Карак панскі скалатнуць,
Каб аж вылецеу вон дух.
І з размаху матануць
Аж да Польшчы, аж за Буг!

Бахнуць па гнязьдзе шпікоў,
Дзе асаднікі сядзяць.
Ёсьць каму без палякоў
Наша поле абрабляць.

Не хавайся ксёндз і пан —
Кожны з вас прадажны чмут
Жар рукою нашай граб.
Жджэць і вас народны суд.

Прэч падаткі, ні граша
Не даваць у іх кішэнь —
Нас паўстанчая каса
Выручыць у трудны дзень.

Прэч абшарнік, фабрыкант,
Годзе нашу кроў вам піць.
Прэч прыблуда-акупант,
Край наш вольным хоча быць.

Рыскую мяжу парваць,
Каб зыднацца нам з С. Б.,
Каб Саветы прывітаць
Ды наладзіць у сябе.

Земляробы-бунтары,
Так чырвонаю мятлой
Вымеўшы тут лад стары,
Навядуць парадак свой.

ПАНСКІЯ ВЫКРУТАСЫ.

Заграбленыя беларускія землі бокам лезуць панскай Польшчы. Рэвалюцыйны ўздым працоўных Зах. Беларусі і Зах. Украіны ў сур'ёз рыхтуецца нізрынуць панскі ўрад. Ратуючыся паны хацелі аб'явіць военнае палажэньне, але паразважыўшы спудзіліся адкрыта выступіць супроць баявых шэрэгаў працоўнай масы. Тады паны сталі прыдумываць розныя выкрутасы і вось прыдумалі ўставу аб прымусовым вывазе насяленьня і маемасьці з абшараў, якім пагражае вайна. Гэты закон створаны выключна для крэсаў, бо ўрад у любы, для сябе падходзячы момант можа пабачыць у нас пагрозу вайны, каб вывясьці багацтва краю і бунтарскі элемэнт і такім чынам паралізаваць рэвалюцыйны рух, а сабе забясьпечыць спакойнае панаваньне. Мы павінны і у гэтым выпадку ўдарыць па габдзюрох панскай жывадзёрнай лапы. Трэба шырака асьведаміць насяленьня Зах. Беларусі аб шкоднасьці і гібельнасьці гэтага закону. Бо хіба-ж мала ў нас розныя акупанты павывозілі і наглумілі краёвага добра? Народ знае ўсяму гэтаму цану і павінен як адзін выступіць супроць гэтых панскіх выкрутасаў і акупанскіх хітрыкаў. Трэба падгатаваць працоўных да масавага выступленьня у абароне краёвай маемасьці. Хай кожны паасобку і ўсе разам, ў той грабежны час дзейcтвуюць рэвалюцыйна і рашуча. Трэба будзе цэлай масай не даваць грабіць, адбіваць награбленае, узрываць масты, цягнікі, псаваць шляхі.. Далей ні адзін селянін і яго сям'я не павінны выезджаць з свайго краю. — Лепш перабыць у суседняй пушчы, схаваць свае дабро, закапаць яго, лепш з чесьцяй загінуць у клясавай барацьбе, як гібець пад панскай ласкай і апекай, альбо згніць у польскіх вастрогах.

ДЗЯРЖАВА ПАНОЎ, АКУПАНТАЎ І ЛЯКАЁЎ АНТАНТЫ.

У сьвятой у Рэчапаспалітай
Салам абрасьлі ксяндзы сьвятыя.
Стада іх сьвятым-жа духам сыты,
За грахі і бедны і худыя.

У шляхоцкай Рэчапаспалітай
Роскашы, распусты пану мала.
Вось таму сяляне і набіты,
І цюрмой народаў Польшча стала.

У грабежна-паліцыйным краі
Ўрад ксяндзоўскі, панскі ды угоды—
Ён сялян бы ліпку абдзірае
Ўсё для бога, краю і свабоды.

Польшча край, адкуль цячэ вякамі
Кроў з пад пят паноў, пят акупантаў.
Польшча на шляху Саветаў камень,
Кінуты пужліваю Антантай.

Ўжо біткoм набітыя вастрогі
І даўно падполле стала цесным.
Ўжо на вуліцу пакрыўджаны, ўбогі
Вышлі бурна, грозна і сумесна.

Тэй мільённай, мускулістай сіле
Толькі ўперад мкнуцца безустанна
І зьядуць паны, што наварылі,
І пажнуць, што сеелі старанна

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ.

Водгукі на Камунікат:

Камунікат ЦК КПЗБ, атрымаўшы самы шырокі водгук сярод партыйнай масы Зах Беларусі, зрабіў сваю аздараўляючую работу, апраўдаў сабе.

Туды, дзе камунікат ня мог дайсьці з прычыны перагародак і абаронных валаў, старанна устроеных варшавякамі, досьць было, каб партыйцы толькі дачуліся аб бальшавіцкай праўдзе камуніката, як ужо ён заваёвываў прыхільнасьць, а партыйныя арганізацыі шукалі сувязі і кіраўніцтва ЦК Зах. Беларусі.

З рэзалюцыяў, атрыманых пакуль да гэтага часу, відаць, што ўся Зах. Беларусь з энтузьязмам адгукнулася на камунікат, за выключэньнем Пінска і Беластока, куды па тэхнічным прычынам мы не маглі яшчэ дайсьці.

У рэзалюцыях рэзка вызначаюцца з аднаго боку прызнаньне рэвалюцыйнасьці ЦК КПЗБ, з другога — закіды і абвінавачаньні па адрасу ЦК КРПП.

ВІЛЕНШЧЫНА з 6-ма падраёнамі на партканфэрэнцыі далучыла свой голас да камуніката і прызывае рэвалюцыянэраў пад сьцяг кампартыі З. Беларусі, якая давядзе рэвалюцыю да пабеднага канца—да аб'еднаньня з БССР. РАБОЧАЯ ЯЧЭЙКА № 1 У ВІЛЬНІ бача ў камунікаце здаровы атпор апартунізму і скрытаму шавінізму. ГРОДНЕНСКІ АКРУЖНЫ КАМІТЭТ выражае падтрымку і спогад ЦК КПЗБ і лічыць яго абаронцам рэвалюцыйных інтарэсаў і кіраўніком рэвалюцыйнай барацьбы ў Зах. Беларусі. ПЛЕНУМ РАЙОННАГА КАМІТЭТА ДЗІСЕНШЧЫНЫ заяўляець, што ўсе сябры партыі і рэвалюцыйнае сялянства будуць змагацца толькі пад кіраўніцтвам Цэка Зах. Баларусі, як выразіцеля волі паднявольнага народу і працоўнай масы. ВІЛЕНСКАЯ БЕЛАР. ЯЧЭЙКА № 2 дамагаецца адкамандыраваньня партработнікаў, прысланых з Варшавы. ВАЛОЖЫНСКАЯ РАЙОННАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ад імя пяці падраёнаў горача вітае даўно чаканае вырашэньне пытаньняў, зьдзесьненае камунікатам, і адзначае шкодную палітыку ЦК Польшчы па нацыянальнаму, аграрнаму і сялянскаму пытаньню НАВАГРУДЗКІ КАМІТЭТ асуждае палітыку ЦК КРПП у адносінах да шырокага вызваленчага руху Зах. Беларусі і заклікае вясьці рэвалюцыйную барацьбу па запаветах Леніна. Н-АЯ ЯЧЭЙКА БАРАНАВІЦКАГА РАЙОНА высказалася за камунікат і прыняла пастанову пашыраць камунікат па другіх ячэйках, доступ да якіх забаронены эмісарамі з Варшавы, з тым, каб усе сябры партыі зналі, што Цэка КРПП робіць тормаз у рэвалюцыйным руху Зах. Беларусі. Ячэйкі ЛУЧ, УДАР, СТРАЛА, МЕЧ, КАСАЎСКАГА РАЙОНА, І ЗВЕЗДА, ВАЛОЖЫНСКАГА РАЙОНА, прызнаюць выданьне камуніката рэвалюцыйным бальшавіцкім шагам і выказываюць свае падтрыманьне Цэка Заходней Беларусі.

Трэба яшчэ адзначыць, што камунікат і далейшая палітыка Цэка Зах. Беларусі ня толькі паставілі на правідловы шлях рэвалюцыйную барацьбу ў З. Беларусі, ня толькі далі сапраўднае бальшавіцкае заснаваньне кампартыі ў Зах. Беларусі, але прыдалі шчыльнасьць і павялічылі партыйныя рады і паднялі рэвалюцыйны ўздым у Зах. Беларусі. Так, напрыклад, да КРЫНСКАГА РАЙОНУ, які прызнаў Цэка Зах. Беларусі, далучыліся яшчэ два падраёны, ў свой час адышоўшыя, будучы нездаволены палітыкай і тактыкай Цэка КРПП, а так сама злучылася з партыяй беларуская паўстанчэская арганізацыя імяні Леніна, якая паўстала на Беларусі без кіраўніцтва кампартыі і істнавала ўвесь час незалежна.

З ГОРАДЗЕНШЧЫНЫ.

Ў Горадні як беларускія так і жыдоўскія таварышы сустрэлі камунікат з энтузьязмам. Акружны Камітэт цалкам далучыўся да тэзысаў ЦК КПЗБ — моладзь таксама. Выключэньнем былі толькі прысланыя з Варшавы работнікі, якія там моцна ўкараніліся. Пабачыўшы ў гэтым пагрозу для сябе, Цэка Польшчы мабілізаваў усе свае сілы, каб зьбіць з толку горадненскіх таварышаў; пры гэтым ужыў самыя агідныя неперборчывыя способы барацьбы, нарушаючы элемэнтарныя правілы этыкі і канспірацыі. Т.т., якія хацелі больш падробна даведацца аб зашоўшым канфлікце, груба выганялі з паседжаньняў. Усё-ткі не змаглі адваяваць сваіх пазыцыяў; ня гледзючы на іхнія рэпрэсыі, удалося ім толькі нарушыць рэвалюцыйны поступ, які безумоўна у хуткім часе ўдасца наладзіць.

За то вёска Горадзенскага вокругу аднагалосна высказалася за камунікат і дружна стала да работы пад кіраўніцтвам ЦК Зах. Беларусі. Намеры варшавякаў працісяуцца на вёску закончыліся аканчальнай неўдачай, бо таварышы ім далі рашучы і заслужаны адпор.

КРЭПАСЬЦЬ ЭМІСАРАЎ—БЕРАСЬЦЕЙСКІ ВОКР. ТРАШЧЫЦЬ.

Берасьцейская акружная партыйная арганізацыя даўно лічылася апораю варшаўскіх эмісараў. Партыйнае кіраўніцтва падбіралася там яўна варожае ўсяму беларускаму. Зусім зразумела, што дабрацца да Берасьця і пашырыць там нашыя думкі мы ня мелі тэхнічнае магчымасьці. Але калі Магамэт ня йдзе да гары, то гара ідзе да Магамэта. Партыйныя масы даведаліся аб здарэньнях у партыі. Яны хацелі атрымаць інфармацыі у стаўленнікаў Варшавы, але тыя ім адказалі, што „нічога няведаюць“. Тады сталі шукаць нас абмацкам. Найлічнейшы раён пастанавіў дэлегаваць аднаго з сваіх актыўных сяброў у Вільню. Тут ён толькі праз тры дні знайшоў нас і даведаўся аба ўсім. Без усякіх агаворак ён далучыўся да камунікату ЦК Заходней Беларусі і заявіў, што ўсе у яго раёне зробяць тое ж самое.

Чарга за Піншчынай.

ЗАСНУЎШЫЯ — ПРАБУДЗІЛІСЯ.

У Горадзеншчыне паў года таму назад два раёны парвалі сувязь з партыяй. Цяпер, пасьля стварэньня сталага краёвага Цэка Зах. Беларусі — заснуўшыя раёны прыслалі сваіх дэпутатаў і заявілі, што гатовы ізноў прыступіць да рэвалюцыйнае працы. „Камунікат“ зрабіў свае. Ён аказаўся тою бомбаю, якая ўшчэнт разарвала снатворнае, нуднае, бюракратычна-казённае кіраўніцтва варшаўскіх эмісараў.

ЛІСТ З СЬВЕНЦЯНШЧЫНЫ.

„Мы былі адарваны ад вас. Аб выступленьні і камунікаце даведаліся толькі з буржуазных газэтаў. У чым справа не магці разабрацца, але дагадаліся, што варшаўскія эмісары пачалі гнуць не ў наш бок. Калі іх прыхільны прывёз нам літэратуру, мы яго папярэдзілі, што прымаемо у апошні раз, бо да Варшавы нам неяк „задалека“, а да Вільні бліжэй, ды і наогул арганізацыя беларуская нам зручней. Чакаем ад вас вестак.

Партыйцы беларусы.

ЛЕНІНЦЫ З НАМІ.

Недавер'е да рэвалюцыйных масаў, адарванасьць ад іх, найгоршыя формы бюракратызму казенных „рэвалюцыанераў“, брак баяздольнасьці і праграмы — ўсё гэта стварыла дужа ненармальныя адносіны паміж рэвалюцыйнымі сіламі краю і афыцыяльнымі органамі партыі, дзе заселі варшаўскія эмісары. Найбольш энэргічныя і сільныя рэвалюцыянеры вёскі проста не хацелі мець нічога супольнага з партыяй і стварылі све незалежныя рэвалюцыйныя арганізацыі у Зах. Беларусі. Адною з такіх арганізацыяў і была „Беларуская паўстанческая арганізацыя імяні Леніна“, якая працавала побач з намі і за кароткі час абхапіла сваімі ўплывамі значную тэрыторыю

Паўстанцы Ленінцы ня толькі вялі сярод сялянства агітацыю за злученьне ўсяе Беларусі пад сьцягам БССР, але і даказалі вернасьць сваім ідэям баявымі выступленьнямі проціў нягодных акупантаў.

Цэлы год паўстанцы Ленінцы працавалі самастойна і ня шукалі Цэка Зах. Беларусі. І толькі пасьля „камунікату“ пастанавілі увайсьці ў кантакт з партыяй. На імя Цэка яны прыслалі праз свайго упаўнаважанага запіску такога зьместу.

„Шчыра вітаем за зроблены бальшавіцкі крок. Верым, што байкам настаў канец і распачнецца баявая праца, да якое падрыхтоўваецца ўвесь беларускі народ“. ЦК Зах. Беларусі, заслухаўшы даклад аб працы паўстанцаў Ленінцаў, пастанавіў прыняць ўсіх іх у свае рады.

ГОЛАС ЛІТОЎСКАГА СЕЛЯНІНА.

Сябар партыі, член Віленскага Акружнага Камітету, літоўскі селянін просіць нас ад яго імяні заявіць:

ЦК Польшчы нас пакінуў і нават не ўспамінае. Да нашых трэбаваньняў ня прыслухоўваецца. Настрой сялянства рэвалюцыйны. Усе сагласны аддзяліцца ад панскае Польшчы. Прыезжыя кіраўнікі мыляцца, што не прыдаюць значэньня прыгнечаным мясцовым масам, беларусам і літоўцам. Што касаецца нас, літоўцаў, то мы будзем змагацца у кантакце з беларусамі і папераджаем варшаўскі Цэка, што ён мыляецца, калі ня слухае нашага голасу.

Ганьба грабежнікам!

РЭЗАЛЮЦЫІ — ПРАТЭСТЫ.

На пасяджэньні пленума раённага камітэту КПЗБ у Маладэчне пастўлена была паміж іншымі і пытаньне аб разгроме і бандыцкім нападзе пасланцоў Цэка Польшчы на нашу партыйную друкарню. Пленум прыняў такую рэзалюцыю:

Ганьба грабежнікам! Па зову Цэка Зах Беларусі ўсе як адзін гатовы абараняць дабро і пакараць віноўнікаў. Аднačасна шлём шчырую падзяку Цэка за яго працу па збудаваньню новае друкарні.

25. II. 1925 г.

Ў рэдакцыю „Чырвонага Сьцягу“ прыслалі свае пратэсты падраёны Лебедзеўскі, Маладэчынскі, Маркаўскі, Бухаўскі, Хопіёўскі, Латыгольскі, Красьненскі, а, так сама і ячэйкі, якія уваходзяць у склад гэтых падраёнаў.

ВАЛОЖЫНСКІ ПАВЕТ.

На канфэрэнцыі прадстаўнікоў 5 падраёнаў у Валожынскім павеце у лічбе 12 чалавек абгаварылі ганебны паступак пасланцоў польскага Цэка — напад на партыйную друкарню. Некаторыя таварышы выказалі ахвоту адабраць сілаю украдзенае партыйнае дабро КП Зах. Беларусі.

1. III.—25 г.

СМАРГОНЬ.

Смаргонскі раённы камітэт на пленарным пасяджэньні па пытаньню аб нападзе на друкарню выражае самы рэзкі пратэст і прапануе варшаўскім грамілам вярнуць партыйную друкарню.

28. II.—25 г.

ВАУКІ У АВЕЧАЙ СКУРЫ.

Камунікат ЦК КПЗБ ня хібіў мэты. З аднаго боку сапраўдна рэвалюцыйныя масы сустэкаюць яго з энтузіязмам, а з другога — каго ён б'ець сьмелымі ўдарымі—корчуцца, адмахіваюцца і як блазны адгаварываюцца: і я не я, і віна не мая. Так сталася в паслом Воевудзкім, ён-жа лідар польскай „Незалежнай Хлопскай Партыі“. Бо як жа пан Воевудзкі, а як пісаў „Белар. Звон“. дык нават польскі абшарнік, пад шумок палітычнай завірухі ў Польшчы уздумаў забаўляцца ў бальшавізм, пачаў пэўна не без задняй думкі праціскацца у рады працоўных Зах. Беларусі, а тут раптам вдзёрлі маску і паказалі партрэт п. Воевудзкага як віднага дэфэнзыўшчыка з рукамі акрываўленнымі сялянскай крывёй. Удар лішня балюча, каб пад ім ня корчыцца і не адмахівацца. І вось п. Воевудзкі, ня гледзючы, што „Нез. Хлоп. Партыя“ мае сваю часопісь для сялян, аднак не адважыўся „ў імя праўды“, як кажа, адкрыта і шчыра выступіць перад беларускай вёскай, бо сяляне сваім рэвалюцыйным чуцьцём хутка бы адчулі фалш гэтай курататай праўды і здагадаліся-б, што дым без агня ня бывае. Пан Воевудзкій туляючыся як воўк па задворках прадажна-здрадніцкай прэсы, піша пісьмо поўнае супярэчнасьцяў і недарэчнай лухты. Пісьмо гэтае друкапаў сабе яму; ён з гонарам прызнаецца (заўважце: не каіцца), што быў шэфам аднэй з сэкцыяў II адзелу польскіх войск, а дзейнасьць гэтага II адзелу сяляне Беларусі могуць пасьветчыць рубцамі сваіх ран і курганамі магіл растрэленых.

Воевудзкі пісьмом сваім выкапаў сабе яму; ён з гонарам прызнаецца (заўважце: не каіцца), што быў шэфам аднэй з сэкцыяў II адзелу польскіх войск, а дзейнасьць гэтага II адзелу сяляне Беларусі могуць пасьветчыць рубцамі сваіх ран і курганамі магіл растрэленых.

Далей Воевудзкі божыцца ў сваёй шчырасьці да беларускага руху і ссылаецца на прыяцеляў беларускіх дзеячоў. Лічым патрэбным тут адзначыць, што камуністычная партыя наогул, так і Зах. Беларусі самым рашучым способам змагаецца з т. наз. нацыялістычнымі незалежнікамі, у якіх нацыянальнае адраджэньне ёсьць мэта, а на срэдства, якія па злой волі ці па несьвядомасьці разбіваюць рады працоўных і гэтым узмацоўваюць сусьветную буржуазію. А вось такіх дабрадзееў буржуазіі, беларускіх незалежнікау, а сваіх прыяцеляў і бараніў Воевудзкі.

Прызнаючыся да гэтай новай сваёй „заслугі“, бальшэвіствуюшчы Воедудзкі яшчэ лішні раз падчыркнуў сваё ідэолёгічнае калецтва і палітычнае авантурыцтва.

Мы ўжо казалі і цяпер паўтараем Воевудзкаму: прэч брудныя рукі ад рэвалюцыйнага руху! Працоўныя масы ідуць да яснай мэты і простай дарогай, яны хутка пазнаюць фарбаваных лісаў і ваўкоў у авечай скуры і рашуча расправяюцца з ворагамі працоўнае клясы.

Канспірацыя, актыунасьць.

Арганізацыі кампартыі Зах. Беларусі, знаходзючыся ў глыбокім падпольлі, у сваёй працы галоўным чынам павінны мець на ўвадзе канспірацыю, актыўнасьць і дысцыпліну.

Калі ў вёсцы ёсцьць ячэйка, дык тав., агітуючы сялян, не павінен выказываць другіх таварышаў, не павінен ім гаварыць т а г о, ш т о м о ж н а, а т о л ь к і т о е, ш т о т р э б а д л я с п р а в ы. Часамі сказанае лішняе слова можа загубіць усю арганізацыю. Трэба заўсёгды спадзявацца обыску і арышта і дзеля таго як пры сабе так і ў хаце нельга трымаць кампрымітуючых рэчаў. Ня варта запісываць таго, што можа скампраміта ваць, а так жа адрасы — лепш насіць усё ў памяці, а калі запісаў, дык выкарыстаўшы знічтож.

Калі арыштуюць, дык ня пужайся, а усю ўвагу згуртуй над тым, каб не прасыпаць таварышаў і самаму выкруціцца. Абдумай пытаньні, якія могуць табе задаць і на іх адказы. Пры дапросе мала гавары і адказывай коратка ды трымай сябе як належыць партыйцу і памятай, што ў цюрме сьцены ня толькі вушы, але і вочы маюць. Перад чужымі людзьмі ня варта з таварышамі ўжо натта кумавацца ды сябрыць—лепш быць незнаёмымі. На тэхніка арганізацыі выбірайце чалавека, які і пад зямлёй бача, у вагні не гарыць, у вадзе на тоне.

Актыўнасьць гэта першая адзнака каждага камуніста Таварыш, які прызнаў праграму партыі, але абібок, патрэбен партыйнай арганізацыі, як дзюрка ў мосьце. Абавязак кожнай ячэйкі сьлядзіць за актыўнасьцяй таварышоў, навучаць, папераджаць, а не памагае, дык гнаць мятлой—лепей менш ды лепш, як казаў Ленін.

Хто самаахвярна не аддае свае сілы, час і працу на карысьць партыі, а значыць і пралетарыята, той не павінен быць членам партыі, ён не камуніст.

Абавязак ячэйкі кантраляваць дзейнасьць кожнага таварыша, які павінен быць адказным за тое, што робіць. Усе ўпушчэньні па працы павінны неадкладна і срога карацца, каб не ўвадзіць дэзарганізацыі і мляўкасьці.

ЦК сьведчыць атрыманьне на пакрыцьце доўгу:

Тад 10 зл., Міх 3 зл., Я — 10 зл., С — 2 зл., Мор 5 зл., Маня 2 зл., 10 з. — 2 зл., А— 10 зл., В — 3 зл., „Прэч імпэрыялістаў!“ — 10 зл., Л — 2 зл., Сь — 5 зл. Разам 65 зл.

Для палітычн. арыштаваных па лісту № 451 — 14 зл.

Таварышы!

Падасланыя варшаўскім ЦК грамілы зруйнавалі нашу падпольную друкарню На пабудову новае друкарні ЦК Кампартыі Заходней Беларусі прымушан быў пазычаць грошы, якія трэба аддаць. Абавязак кожнага сябра дапамогчы партыі:— ахвярваць самому і зьбіраць ахвяры сярод спачуваючых, каб пакрыць даўгі і на Фонд Друку.

ВІЛЬНЯ, ДРУКАРНЯ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.